


# МЫ АДКАЗНЫЯ ЗА ЛЁС НАШАЙ РАДЗІМЫ


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ЛІПЕНЯ 2007 г. СЕРАДА

№ 122 (25987)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


## Прэзідэнт Беларусі, Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі краіны прыняў парад войскаў

**Кіраўнік дзяржавы, Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 3 ліпеня прыняў удзел ва ўрачыстасцях з нагоды Дня Незалежнасці і 63-й гадавіны вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Прэзідэнт Беларусі ўсклаў вянок да манумента Перамогі. Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел вышэйшыя службовыя асобы краіны, кіраўнікі дзяржаўных органаў, сілавых міністэрстваў, ведамстваў, ветэранскіх, прафсаюзных і маладзёжных арганізацый, Выканкама СНД, праваслаўнага і каталіцкага духавенства, а таксама прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса. Мінутай маўчання прысутныя ўшанавалі памяць загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

У той жа дзень Прэзідэнт Беларусі, Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі краіны прыняў парад войскаў Мінскага гарнізона, які прайшоў каля стэлы «Мінск — горад-герой».

Пасля ўрачыстасцяў Прэзідэнт Беларусі наведаў Свята-Духаў кафедральны сабор, дзе паставіў свечку ў памяць аб беларусах — загінулых воінах і бязвінных ахвярах Вялікай Айчыннай вайны.

**БЕЛТА.**

# НАРОД-ПЕРАМОЖЦА, НАРОД-СТВАРАЛЬНІК ПРЫКЛАДЗЕ ЎСЕ НАМАГАННІ ДЛЯ АБАРОНЫ І ЎМАЦАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

***Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. ЛУКАШЭНКІ на парадзе ў азнаменаванне Дня Незалежнасці і 63-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 3 ліпеня 2007 г.***

Дарагія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны!

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі, афіцэры і генералы!

Паважаныя суайчыннікі і госці Беларусі!

63 гады таму, 3 ліпеня 1944 года, Мінск быў вызвалены ад фашысцкіх захопнікаў. І цалкам справядліва, што менавіта гэта гістарычная дата па волі беларускага народа стала галоўным святам беларускай дзяржаўнасці — Днём Рэспублікі.

Кожны раз у гэты дзень мы ўспамінаем тых, хто, ахвяруючы самым дарагім — сваім жыццём, прынёс доўгачаканую свабоду.

Наш народ, які перанёс неймаверныя беды фашысцкай акупацыі і пазнаў радасць Вялікай Перамогі, заўсёды будзе помніць, якая цана заплачана за мір і незалежнасць.

Бо менавіта Беларусь, якая першая прыняла на сябе ўдар фашысцкай армады, панесла самы вялікі ўрон сярод усіх рэспублік былога Савецкага Саюза і дзяржаў сусветнай супольнасці. Наша краіна страціла кожнага трэцяга жыхара. Сотні гарадоў і тысячы вёсак былі поўнасцю знішчаны або разбураны.

Спатрэбілася не адно дзесяцігоддзе, каб рэспубліка змагла аднавіць агульную даваенную колькасць свайго насельніцтва. З руін і попелу нанава адбудавацца. Дзякуючы гераічным намаганням беларускага народа, брацкіх народаў саюзных рэспублік Беларусь зноў набыла сваё непаўторнае аблічча.

Беларускі народ яшчэ раз даказаў, што ваенная доблесць пры абароне Айчыны і працоўныя подзвігі ў імя стварэння з'яўляюцца неад'емнай часткай нацыянальнага характару.

З кожным годам Вялікая Айчынная ўсё далей адыходзіць у гісторыю. Рэхам мінулай вайны гучыць над беларускай зямлёй набатны бой званоў Хатыні. Гучыць напамінам нашчадкам аб вельмі цяжкіх выпрабаваннях, што выпалі на долю многіх народаў.

Вялікая Перамога над нацызмам атрымана агульнымі намаганнямі сусветнай супольнасці. І мы высока цэнім уклад у барацьбу з фашызмам усіх краін антыгітлераўскай кааліцыі.

Здавалася б, памяць аб мільённых ахвярах павінна была прымусіць усіх палітыкаў помніць пра вынікі вайны. Тым не менш, колькасць і маштабы выклікаў і пагроз міжнароднай бяспецы не змяншаюцца. У іх ліку агрэсіўныя ваенныя канфлікты, новы віток гонкі ўзбраенняў, рэлігійны, нацыянальны і палітычны экстрэмізм, міжнародны тэрарызм, гандаль людзьмі, наркатрафік.

Прасоўванне ваеннай інфраструктуры НАТА на ўсход і плануемае размяшчэнне элементаў амерыканскай сістэмы проціракетнай абароны ў сумежных з Беларуссю дзяржавах сур'ёзна ўскладняюць ваенна-палітычную сітуацыю паблізу нашых граніц. Падарвана і фактычна не дзейнічае адна з асноў еўрапейскай бяспекі — адаптаваны Дагавор аб звычайных узброеных сілах у Еўропе. І ўсё гэта пад маўчанне нашых дэмакратычных развітых еўрапейскіх дзяржаў.

Мы не можам не ўлічваць гэтыя фактары ў пабудове ўласнай сістэмы нацыянальнай, і ў першую чаргу ваеннай, бяспекі.

Нельга дапусціць аднабаковага раззбраення, аслаблення бяспекі і абараназдольнасці Саюза Беларусі і Расіі, нашай агульнай прасторы. Нягледзячы на складанасці ў эканамічных адносінах з Расіяй, Беларусь заўсёды будзе верная саюзніцкім адносінам і будзе выконваць падпісаныя пагадненні. З гонарам несці сваю, прычым немалую, долю адказнасці за абарону Саюзнай дзяржавы.

Усямернае ўдасканаленне, умацаванне і развіццё Узброеных Сіл і ўсёй ваеннай арганізацыі дзяржавы будзе і ў далейшым адным з прыярытэтаў кіраўніцтва краіны.

Хачу запэўніць беларускі народ, што сістэма нацыянальнай бяспекі гатова надзейна абараніць канстытуцыйныя ўстоі, суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, мір і спакой грамадзян.

Падзеі гэтага года яшчэ раз паказалі, што ў сучасным свеце бяспека любой дзяржавы не абмяжоўваецца толькі ваеннымі або сілавымі аспектамі.

У міжнародным жыцці ўсё большае распаўсюджванне атрымлівае выкарыстанне інфармацыйнай экспансіі, палітычнага шантажу, санкцый і эканамічных рычагоў для націску на краіны, якія праводзяць незалежную палітыку.

Паважаныя таварышы!

У любых умовах наша дзяржава забяспечыць паслядоўнае ўмацаванне нацыянальнай бяспекі па ўсіх яе складальніках — ад абароннага да харчовага. Суверэнітэт і незалежнасць, мір і стабільнасць на беларускай зямлі і ў далейшым будуць захаваны.

Гістарычны выбар беларускага народа непарушны!

Так было, так ёсць і так будзе заўсёды. Беларускі народ, народ-пераможца, народ-стваральнік прыкладзе ўсе намаганні для абароны і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці. Гэта найвышэйшае дасягненне нашай гераічнай гісторыі.

Слава беларускаму народу, які адстаяў незалежнасць Айчыны!

Вечная слава героям, якія загінулі ў баях за Радзіму, аддалі свае жыцці за свабоду і шчасце будучых пакаленняў!

Будзем дастойны іх вялікага подзвігу!

Асаблівыя віншаванні, мае паважанні ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Тым, хто, не шкадуючы жыцця свайго, змагаўся з ворагамі на фронце. Тым, хто ў тыле каваў зброю Перамогі.

Дзякуй за тое, што вы выстаялі, вынеслі на сваіх плячах цяжар самай страшнай вайны мінулага стагоддзя!

Няхай заўсёды будзе мірным неба, светлая будучыня і працвітанне нашай любімай Радзімы!

Са святам! З Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь!

Слава абаронцам Айчыны!

Ура!







**Былы франтавік-танкіст Васіль ЦЮНІС прыехаў у сталіцу на свята з Оршы. Яму давялося ваяваць на розных франтах.**

**— Але асабліва мне запомніліся Сталінград і Берлін, дзе я пакінуў аўтограф на сцяне рэйхстага, — сказаў у кароткім інтэрв'ю пра сябе Васіль Дзмітрыевіч.**

# «БЕЛАРУСЬ АДБЫЛАСЯ ЯК САМАСТОЙНАЯ СУВЕРЭННАЯ І НЕЗАЛЕЖНАЯ ДЗЯРЖАВА»

**Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. ЛУКАШЭНКІ на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі) 2 ліпеня 2007 г.**

Дарагія суайчыннікі!

Паважаныя госці!

Мы адзначаем галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 63-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад фашызму.

Свята Незалежнасці — гэта даніна павагі многім пакаленням беларускага народа, якія цаной вялікіх намаганняў і ахвяр заваявалі свабоду сваёй краіны.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на часова акупаванай нямецкімі войскамі тэрыторыі разгарнулася небывалае па маштабах усенароднае супраціўленне.

На абарону роднай зямлі, на барацьбу з прыгнятальнікамі ўзняліся шырокія масы. Сотні тысяч нашых грамадзян змагаліся ў партызанскіх атрадах і ў падполлі. Усенародная барацьба была глыбінным праяўленнем людскога гневу, непрыманнем насельніцтвам фашысцкай акупацыі.

Больш як мільён ураджэнцаў беларускай зямлі ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў складзе Чырвонай Арміі і Ваенна-марскога флоту плячо ў плячо з прадстаўнікамі брацкіх народаў Савецкага Саюза. Яны стаялі насмерць пад Кіевам, Масквой, Ленінградам і Сталінградам, вызвалялі Украіну, Малдавію, Прыбалтыку, Польшчу і іншыя краіны Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, дабівалі нацызм у яго логаве.

У той вайне савецкі народ быў асноўным шчытом не толькі для Еўропы, але і ўсёй сусветнай супольнасці супраць прыгнёту. І мы ганарымся тым, што часткай гэтага народа і вялікай краіны былі мы — беларусы.

Найважнейшым фактарам гістарычнай Перамогі была здольнасць савецкіх людзей з'яднацца ў барацьбе за справядлівую справу, праявіць лепшыя якасці — патрыятызм, самаадданасць, калектывізм.

Мы шануем і помнім тых, хто набліжаў Вялікую Перамогу. Іх імёны, жывых і загінулых, навечна ўпісаны ў беларускую гісторыю.

Уклад Беларусі ў Перамогу быў рэальна ацэнены сусветнай супольнасцю — рэспубліка стала адной з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Сапраўдны працоўны гераізм праявіў наш народ у пасляваенныя гады. Вайной было знішчана больш як палавіна нацыянальнага багацця рэспублікі, дзесяткі тысяч населеных пунктаў былі проста сцёртыя з зямлі.

Разбураную народную гаспадарку аднаўлялі ўсёй грамадой. Вялікую дапамогу ў гэтым аказалі былыя рэспублікі Саюза, і перш за ўсё — брацкая Расія. Таму ўдарнымі тэмпамі не толькі адбудавалі разбуранае, але і пабудавалі новыя прадпрыемствы, якія ў далейшым вызначылі індустрыяльнае аблічча нашай краіны.

Беларусь у складзе СССР упэўнена ўтрымлівала лідзіруючыя пазіцыі па многіх эканамічных і сацыяльных паказчыках. Але краіну, якая стала на ногі і памацнела, чакаў яшчэ не адзін удар гісторыі. Спачатку самая вялікая тэхнагенная катастрофа — Чарнобыль, затым геапалітычная — развал Савецкага Саюза яшчэ раз паставілі рэспубліку на самы край прорвы.

Аднак і ў гэтых умовах беларускі народ не здаўся і зноў паказаў сваю мудрасць, працавітасць, трываласць і аптымізм. Але ўжо — паасобку. З'яднаўшыся дзеля адзінай мэты (пераадолець бяду і выйсці з крызісу), ён змог дабіцца поспеху.

Беларусь першая сярод постсавецкіх рэспублік выйшла на дакрызісны ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэта з поўным правам можна назваць Перамогай, самай вялікай Перамогай, дастойным працягам слаўнай гісторыі народа.

І сёння духоўна-маральныя ідэалы запатрабаваны новымі пакаленнямі беларусаў. Нашчадкі воінаў-вызваліцеляў сваімі працоўнымі дасягненнямі апраўдваюць сваё гістарычнае прызначэнне — прымнажаць здабытак нашай Радзімы, забяспечваючы тым самым яе свабоду і незалежнасць.

Сёння мы з гордасцю заяўляем, што Беларусь адбылася як самастойная суверэнная і незалежная дзяржава.

Суверэнітэт — гэта найвялікшая заваёва народа, найважнейшая перадумова самастойнасці дзяржавы ў вызначэнні канкрэтных напрамкаў яе ўнутранай і знешняй палітыкі.

За кароткі гістарычны тэрмін незалежнага развіцця мы здолелі зрабіць нашу краіну стабільнай, цывілізаванай, паспяховай. Выпрацавана і паспяхова рэалізуецца нацыянальная мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця, заснаваная на актыўнай рэгулюючай ролі дзяржавы і ўзважаных, прадуманых, эвалюцыйных пераўтварэннях.

Нават заходнія эксперты, якія не асабліва любяць нашу суверэнную дзяржаву, прызнаюць, што Беларусь знаходзіцца ў ліку лідараў сярод краін СНД па ўзроўню індэкса чалавечага развіцця — крытэрыю, які комплексна паказвае сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў дзяржаве.


*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



ISSN 1990 - 763X



БЕЛАРУСБАНК

1922-2007 85 ЛЕТ

НОВЫЙ ВКЛАД

в белорусских рублях



"Удобный плюс"

УДОБНО И ПРОСТО!

- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Автоматическое переоформление на новый срок, аналогичный первоначальному. Указанное правило действует один раз.
- По истечении двух сроков хранения производится переоформление на новый вклад "ЮБИЛЯР"

Вносится наличными и безналичными денежными средствами

Срок хранения вклада — 25 календарных дней

Фиксированная ставка — 12% годовых

Минимальная сумма вклада — 100 000 белорусских рублей

Сохранность и возврат вкладов в АСБ «Беларусбанк» гарантируются в порядке, установленном законодательством РБ.

www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка РБ № 1 от 27.10.2006г.









# «БЕЛАРУСЬ АДБЫЛАСЯ ЯК САМАСТОЙНАЯ СУВЕРЭННАЯ І НЕЗАЛЕЖНАЯ ДЗЯРЖАВА»



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Наша краіна ўпэўнена ўступіла ў новы этап свайго развіцця.

І ў гэтым, вельмі складаным для нас годзе — складаным з-за пэўных, вядомых вам прычын, — у Беларусі аднымі з самых высокіх на постсавецкай прасторы застаюцца паказчыкі валавога ўнутранага прадукту (прырост больш як 9 працэнтаў), інвестыцый (25 працэнтаў). Узровень беспрацоўя — адзін з самых нізкіх. Нам на прадпрыемствы патрабуецца больш людзей, чым сёння беспрацоўных. Але ўжо сёння прадпрыемствы не кожнага бяруць на работу — патрабаванні да персаналу пастаянна ўзрастаюць.

Я сказаў аб росце валавога ўнутранага прадукту. Еўропа прырастае на 1,5—2 працэнты. Тое ж самае — Злучаныя Штаты. Мы які год маем рост каля 10 працэнтаў. І звярніце ўвагу: гэты валавы ўнутраны прадукт дасягнуты розумам і рукамі. У нас няма тых энергарэсурсаў, нафты, газу, металу, руд, золата і іншага, што забяспечвае валавы ўнутраны прадукт у нашых суседзяў. Усё гэта плён розуму і рук. Як у нас кажуць, рэальнага сектара эканомікі. А гэта значна цяжэй. У сто разоў цяжэй, чым прырастаць за кошт нафты, газу і прыродных рэсурсаў.

Сацыяльная сфера ў Беларусі развіваецца стабільна. Толькі за 2006 год створана больш за сто тысяч новых рабочых месцаў. Правадзімая палітыка па павышэнню аплаты працы дала магчымасць амаль на 18 працэнтаў павялічыць рэальную заработную плату, зменшыць долю малазабяспечанага насельніцтва да 11 працэнтаў. Рэальны рост пенсій за год склаў больш як 20 працэнтаў.

Радуе, што ў Беларусі намецілася тэндэнцыя да павелічэння колькасці заключаемых шлюбаў, а таксама нараджальнасці. Прычым не толькі ў сталіцы, але і ў рэгіёнах. У мінулым годзе ўпершыню за апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі павялічылася нараджальнасць і адначасова знізілася смяротнасць.

Для кардынальнага паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі мы будзем ажыццяўляць мэтанакіраваную палітыку дзяржавы па захаванню традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, аднаўленню спрадвечных беларускіх традыцый беражлівых адносінаў да бацькоў, сям'і, дзяцей.

Не выпадкова гэты год мы аб'явілі Годам дзіцяці. Такое рашэнне падмацавана цэлым комплексам мераў па рэалізацыі дзяржаўнай мэтавай праграмы «Дзеці Беларусі». Дзяржава пастаянна пашырае віды аказваемай сем'ям сацыяльнай падтрымкі. Памер аднаразовай дапамогі пры нараджэнні дзіцяці, асабліва другога і наступных дзяцей, пастаянна павялічваецца. Маладая сям'я мае магчымасць атрымаць ільготны крэдыт на жыллёвае будаўніцтва. Шматдзетным сем'ям жыллё прадастаўляецца ў першачарговым парадку і са значнымі скідкамі па аплаце, а малазабяспечаныя сем'і атрымліваюць дзяржаўнае сацыяльнае жыллё ў карыстанне.



Мы і ў далейшым будзем думаць, як дапамагчы тым, хто сёння нараджае дзяцей. Гэта найважнейшая сацыяльная задача, якую мы павінны вырашыць. Калі мы яе не вырашым, будзе пастаўлена пытанне аб бяспецы і незалежнасці нашай дзяржавы.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржавы на справе, а не на словах арыентавана на чалавека.

Паўсюднае ўкараненне сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў, будаўніцтва аграгарадкоў, развіццё рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадоў забяспечвае выраўноўванне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі на ўсёй тэрыторыі краіны.

Беларусь актыўна інвестуе грошы ў здароўе людзей. Сёння жыхару глыбінкі ўжо не трэба ехаць у сталіцу для правядзення абследавання або лячэння. Усе без выключэння рэгіёны, я маю на ўвазе раённыя цэнтры, маюць буйныя бальніцы, а ў абласцях — медыцынскія цэнтры, сетку амбулаторый і паліклінік, аснашчаных па апошняму слову тэхнікі.

У Рэспубліцы Беларусь прадаўжаецца будаўніцтва буйных спартыўных комплексаў еўрапейскага і сусветнага ўзроўню. Безумоўна, гэта база для развіцця нацыянальнага спорту. Стадыёны, басейны і іншыя спартыўныя пляцоўкі даступныя таксама ўсім жадаючым мясцовым жыхарам — ад дзетвары да людзей сталага ўзросту.

І я вельмі рады, што сёння няма тых скептычных заяў, як гэта было 5—7 гадоў таму, калі некаторыя разважалі: «Ну вось, падзялілі б гэтыя грошы, зарплаты былі б вышэйшыя, навошта нам гэтыя спартыўныя аб'екты?». А з іншага боку, умеюць разважаць, пачынаючы ад кухні і завяршаючы буйнымі нарадамі, што «нам трэба моладзь выцягнуць з вуліцы, зрабіць яе жыццё больш бяспечным, зрабіць нашу моладзь культурнай і здаровай».

Скажыце — а як? Здароўе — самая дарагая рэч. Моладзь, каб яе зрабіць такой, як сёння хоча старэйшае пакаленне, каб яна сапраўды была дастойная вас, — гэта каштуе яшчэ даражэй. І ў гэта трэба ўкладваць рэальныя грошы, таму што словамі гэту праблему яшчэ ніхто ў свеце на вырашыў.

Рэалізуючы моцную і маштабную сацыяльную палітыку, наша дзяржава застаецца ашчаднай і стараецца быць справядлівым гаспадаром. Мэта сацыяльнай дапамогі не ў раздачы, як кажуць у народзе, «усім сястрыцам — па завушніцах». Сістэма дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі грунтуецца на прынцыпе адраснай накіраванасці. Таму мы наводзім элементарны парадак у прадастаўленні льгот розным катэгорыям насельніцтва. Зэканомленыя сродкі пойдуць менавіта ў сацыяльную сферу і канкрэтна — дзецям.

Сёння мы канстатуем факт, што дзяржава, як ніколі, наблізілася да чалавека. Але я вельмі добра ведаю, што наша жыццё, жыццё нашых людзей, яшчэ прадаўжаюць атручваць такія рэцыдывы, як фанабэрыя з боку кіраўнікоў, чыноўнікаў. Бюракратызм, калі чалавека па кругу запускаюць за якой-небудзь даведкай, якая сто гадоў нікому не патрэбна. А калі нават і патрэбна, ён не павінен хадзіць і кланяцца чыноўнікам.

Вы ведаеце, што ў апошні год мы распрацавалі і я падпісаў тры Дырэктывы.

Дырэктыва № 1 — дысцыпліна і парадак. Дысцыпліна на вытворчасці і парадак у краіне. Аж да жорсткай ацэнкі работы праваахоўных органаў.

Другая Дырэктыва, якая была выдадзена мною і за якую адказваюць канкрэтныя людзі — вышэйшыя службовыя асобы персанальна, — датычыцца выкаранення бюракратызму.

І зусім нядаўна — трэцяя Дырэктыва, якая датычыцца беражлівасці, нашай энергетычнай бяспекі. Гэта таксама ў эканоміцы найважнейшая задача. Важней няма. Калі б мы сёння былі незалежныя ў плане энергетыкі, можна было б канчаткова і беспаваротна сказаць: нашу краіну ніхто і ніколі назад не паверне. Але мы вельмі залежныя па гэтаму важнейшаму для эканомікі паказчыку — энергазабяспечанасці.

Вы ведаеце: залежныя толькі ад адной краіны. І дыверсіфікацыя гэтай залежнасці для нас выйшла сёння на першае месца. Мы вымушаны, падкрэсліваю, вымушаны шукаць сваё шчасце за блізкім светам, дамаўляючыся з іншымі па здабычы нафты, іншых вуглевадародаў і так неабходнай дня нашай эканомікі сыравіны. І будзьце ўпэўненыя — мы гэта зробім. І зробім у бліжэйшы час. Як бы камусьці гэтага не хацелася.

Сёння галоўная задача — незалежна ад кан'юнктуры цэн, якая змянілася, найперш на энерганосьбіты, захаваць набраныя тэмпы, поўнасцю выканаць планы развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы, намечаныя вамі на трэцім Усебеларускім народным сходзе. У асноўным гэта можа быць дасягнута за кошт унутраных рэзерваў — эфектыўнай вытворчасці і беражлівасці, аб якіх я толькі што гаварыў.



Я яшчэ раз хачу падкрэсліць: мы павінны ажыццявіць эфектыўныя меры па забеспячэнню энергетычнай бяспекі краіны.

Нам патрэбны маштабныя структурныя пераўтварэнні ў энергетычнай галіне, уключаючы будаўніцтва сваёй надзейнай атамнай станцыі.

Таксама неабходна паскорыць працэс укаранення новых прагрэсіўных тэхналогій у вытворчасць. Шлях да гэтага ў нас адзін — паскораны пераход да эканомікі інавацыйнай, навукаёмістай, рэсурсазберагальнай, канкурэнтаздольнай на сусветным рынку.

Навука і інавацыі ператвараюцца ў рашаючы фактар эканамічнага развіцця, таму ў першую чаргу трэба забяспечыць рэальнае ўзаемадзеянне навукі і вытворчасці.

І яшчэ адна заўвага. Пасля таго як выбухнуў вядомы крызіс у адносінах з Расійскай Федэрацыяй па пастаўках энергарэсурсаў у нашу краіну, а канкрэтна — рэзкае павелічэнне цэн на энергарэсурсы (дарэчы, такога прэцэдэнту гісторыя не памятае), у нашым грамадстве з'явіліся чуткі, што Прэзідэнту давядзецца згарнуць сацыяльныя праграмы. Вось мы пражылі ўжо паўгода. Ну, і што мы згарнулі? Мы нічога не згортвалі і нічога згортваць не маем намеру. Як бы цяжка нам ні было — гэта не вайна, гэта не 41-ы і не 45-ы. Мы павінны выстаяць і дасягнуць тых параметраў і мэтаў, якія мы паставілі перад сабой.

Няма ніякага страху і катастрофы ў тым, што адбылося, хоць гэта было няпроста пераадолець. І я не кажу, што заўтра будзе проста. Нідзе ніколі проста не было і не бывае. Але гэта не катастрофа. Па вялікаму рахунку, наша насельніцтва гэтага і не заўважыла. І мы, найперш я як абраны вамі Прэзідэнт, будзем рабіць усё для таго, каб вы маглі спакойна займацца сваёй справай, выхоўваць дзяцей. А мы — улада, якую вы вызначыце, — будзем займацца забеспячэннем адпаведнага ўзроўню бяспекі нашай дзяржавы і арганізацыяй нашага грамадства на дасягненне асноўных намечаных мэтаў і планаў.

Паважаныя таварышы!

Тым не менш, мы жывём у няпросты час. Многае вызначаецца тым, як дзяржава рэалізоўвае заканамерныя памкненні грамадзян, апраўдвае іх чаканні. Калі мы хочам быць адзіным народам, які жыве ў паспяховым грамадстве (а мы, несумненна, хочам гэтага), нам неабходна пастаянна думаць аб умацаванні і развіцці духоўна-маральных і ідэалагічных асноў нашага грамадства.

Прытым часам не трэба нічога выдумваць — разумныя людзі абапіраюцца на той вопыт, які назапашаны да гэтага часу. І гэты вопыт у асноўным быў правільны і станоўчы. Мы гэта, праз дзесяцігоддзі нашага боўтання ў так званым рынку, нарэшце, усвядомілі і зразумелі.



Сучасныя тэхналогіі маніпуляцыі масавай свядомасцю, рэцэпты «каляровых рэвалюцый», знешнія інфармацыйныя і ваенныя пагрозы робяць надзвычай актуальнай праблему выхавання патрыятычнай, духоўна багатай асобы, чалавека, адданага ідэалам і маральным каштоўнасцям сваёй краіны і свайго народа.

Беларускі народ зрабіў свой выбар. Гэты выбар забяспечвае глыбінную гістарычную сувязь з нацыянальнымі духоўнымі вытокамі і каранямі, абапіраючыся на фундаментальныя духоўныя каштоўнасці нацыі, захоўваючы яе адзінства. Ён выключае агрэсіўнасць і экспансію, якія пагражаюць праву іншых народаў на самастойнае вызначэнне свайго сацыяльнага ўладкавання.

Відавочна, што ідэалогія беларускай дзяржавы пры гэтым з'яўляецца важнейшым фактарам кансалідацыі нацыі, неад'емнай умовай, якая забяспечвае гарманізацыю грамадскіх адносінаў, выхаванне патрыятызму, грамадзянскай актыўнасці і адказнасці, захаванне культурна-гістарычнай пераемнасці і нацыянальнай годнасці.

Канешне, у нас хапае нявырашаных праблем. Але сумеснымі намаганнямі, сваёй стваральнай працай беларускі народ здольны пераадолець цяжкасці, якія маюцца, дабіцца высокага ўзроўню жыцця, істотна павысіць міжнародны аўтарытэт, значна замацаваць суверэнітэт і незалежнасць нашай Беларусі.

Наша стратэгічная мэта пабудовы эканамічна моцнай, сацыяльна справядлівай, незалежнай дзяржавы на аснове яе паступальнага развіцця застаецца нязменнай.

Дарагія сябры!

Сёння становіцца відавочным, што захаваць незалежнасць і ўстойлівае развіццё дзяржавы можна толькі праводзячы ўзважаную, шматвектарную знешнюю палітыку.

Канешне, безумоўны прыярытэт мы аддаём раўнапраўнаму супрацоўніцтву з Расійскай Федэрацыяй, дзякуючы сумесным дзеянням з якой мы зможам паспяхова процістаяць пагрозам і выклікам, якія ўзнікаюць у свеце.

У апошнія два гады на больш высокі ўзровень выйшлі двухбаковыя сувязі з удзельнікамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У прыватнасці, з'явіліся шматабяцаючыя перспектывы ўзаемадзеяння Беларусі з Азербайджанам, Казахстанам, Украінай.

Такое двухбаковае супрацоўніцтва развіваецца адначасова з дзейнасцю ў рамках існуючых інтэграцыйных утварэнняў, хоць прэтэнзій да іх вельмі шмат.

За апошнія гады наладжана прадуктыўнае ўзаемадзеянне з краінамі Азіі, Афрыкі, Блізкага Усходу, Лацінскай Амерыкі. Пераканаўчы прыклад — супрацоўніцтва з Кітаем, Іранам, Венесуэлай, Індыяй, В'етнамам, Малайзіяй.

Безумоўна, мы зацікаўлены ў нармальных, узаемавыгадных адносінах і з Еўрасаюзам, і са Злучанымі Штатамі. Але для гэтага трэба весці паўнацэнны, узаемапаважны дыялог. На парытэтных пачатках, без зневажальных папярэдніх умоў і масіраванага ціску.

Апошнім часам нас пужалі, а хтосьці і ўводзіў супраць нас нейкія гандлёвыя санкцыі. Яшчэ раз хачу падкрэсліць: супакойцеся. Мы не загінулі пад прэсам рэзкага павышэння цэн на энерганосьбіты і не памром ад 20—30 мільёнаў долараў, якія можам згубіць у сувязі з тымі санкцыямі, якімі пагражаў і якія сёння ўжо ўводзіць Еўрапейскі саюз.

Яны паказалі свой твар. Яны сёння садзяцца з намі за стол перагавораў і патрабуюць ад нас, і мы па гэтых пытаннях вядзём з імі перамовы. А другой рукой спрабуюць нас задушыць. Не Лукашэнку, «апошняга дыктатара Еўропы» — яны спрабуюць задушыць беларускі народ і нашу дзяржаву. І не таму, што ў нас мала дэмакратыі, як яны гавораць. Няхай займуцца сваёй дэмакратыяй. Дзякуй богу, у апошні час кіраўніцтва Расіі ім на гэта ўсё часцей і часцей зазначае, і мне няма неабходнасці займацца гэтым аналізам. Але вы цудоўна ведаеце: мы ні адзін народ не паставілі на калені. Мы не пасылаем сваіх салдат за блізкі свет забіваць чужых дзяцей, унукаў, мацярок. Мы займаемся сваёй справай у сваёй краіне.

А прычына гэтага ціску — усё тое, аб чым я сказаў толькі што: ніхто з іх сёння не хоча бачыць на карце свету спакойную, цывілізаваную дзяржаву, якая хутка расце, эканамічна развіваецца ды яшчэ не кланяецца ні перад кім. Нас так і не змаглі паставіць на калені, як бы гэтага не хацелася.

Вось сёння і пачынаюць: ужо чую галасы са Злучаных Штатаў Амерыкі, што «мы тут нешта супраць вас распачнём эканамічна». Хачу з усёй упэўненасцю сказаць, я гэта не экспромтам кажу, я гэта вельмі сур'ёзна абдумаў: калі толькі падобнае адбудзецца, хоць самым нязначным чынам, з боку ЗША, мы ў адказ прымем вельмі жорсткія меры ў адносінах да тых прадпрыемстваў і калектываў, якія сёння працуюць на тэрыторыі Беларусі з боку Злучаных Штатаў Амерыкі. Мы не будзем проста сузіраць і глядзець, як нас спрабуюць сёння не тое што вучыць, а ўжо «нахіляць». Уся наша гісторыя, уся наша барацьба — уклад у абарону цывілізацыі ад нацызму. А што было б, калі б мы не паклалі на алтар кожнага трэцяга, і савецкі народ не страціў бы каля 30 мільёнаў чалавек — вы ведаеце. Таму сёння нас не трэба вучыць. Мы бачым, яны самі паказваюць, якую «дэмакратыю» яны развіваюць у сваіх грамадствах, як яны дзейнічаюць, калі іх багаццям пагражае хоць найменшая небяспека — яны не глядзяць ні на што: ні на людзей, ні на навакольнае асяроддзе, яны выкарыстоўваюць усе магчымыя і немагчымыя метады для таго, каб стабілізаваць у сябе сітуацыю. Вазьміце нядаўнія падзеі ў Германіі, Францыі, іншых краінах.

Паважаныя таварышы!

Мы адказныя за лёс нашай Радзімы. Нас аб'ядноўвае вялікая мэта: пабудаваць моцную і квітнеючую дзяржаву — дзяржаву для народа.

У гэтай складанай і адказнай справе нам надае сілы спадчына пакалення пераможцаў. Сёння дзяржава імкнецца да таго, каб талент і здольнасці кожнага чалавека былі запатрабаваныя і выкарыстаныя на карысць Айчыны.

І дазвольце мне сёння выказаць упэўненасць у тым, што адзінства беларускага народа, аптымізм, вера ў шчаслівую будучыню дапамогуць пераадолець цяжкасці, якія ўзнікаюць на нашым шляху, і дасягнуць пастаўленых мэтаў.

Дарагія сябры!

Я ад усяго сэрца віншую вас з гадавінай вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў і нашым галоўным святам — Днём Незалежнасці!

Шчасця, мірнага неба, здароўя, дабрабыту вам, вашым родным і вашым дзецям!

Дзякую вам. (*Апладысменты.*)



## Расія цвёрда настроена на ўсямерны рух наперад ва ўзаемавыгадным супрацоўніцтве з Беларуссю

**Расія цвёрда настроена на ўсямерны рух наперад ва ўзаемавыгадным супрацоўніцтве з Беларуссю. Аб гэтым гаворыцца ў віншаванні прэзідэнта Уладзіміра Пуціна, накіраваным кіраўніку беларускай дзяржавы Аляксандру Лукашэнку з нагоды Дня Незалежнасці, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Крамля.**

«Пранесеныя праз цяжкія выпрабаванні дружба, узаемная павага і сёння служаць надзейнай асновай для далейшага развіцця нашых добрасуседскіх адносінаў, — адзначаецца ў пасланні. — Перад Расіяй і Беларуссю стаяць у многім агульныя задачы. І для іх паспяховага вырашэння неабходны зладжаныя сумесныя намаганні. Мы цвёрда настроены на ўсямерны рух наперад ва ўзаемавыгадным інтэграцыйным супрацоўніцтве, якое садзейнічае эканамічнаму і сацыяльнаму прагрэсу нашых дзяржаў, умацаванню іх дэмакратычных інстытутаў».

Уладзімір Пуцін назваў сімвалічным, што Дзень Незалежнасці непарыўна звязаны з днём вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. «Нашы народы плячо ў плячо змагаліся за свабоду, кавалі адну на ўсіх Перамогу. І ў Расіі заўсёды будуць помніць подзвігі слаўных сыноў і дачок беларускай зямлі, якія ўзняліся на адпор ворагу», — падкрэсліў кіраўнік расійскай дзяржавы.

**Эдуард ПІВАВАР, БЕЛТА.**









# Як не заплакаць у «дзіцячай Хатыні»...

## У Жлобінскім раёне адкрыты мемарыяльны комплекс «Дзецям — ахвярам вайны»



Гэтае пісьмо нельга чытаць без хвалявання. Без трывогі. Без смутку. Бо яно скрозь насычана імі. Бо яно напамінае: так было. Бо яно заклікае: гэтакія жудасці не павінны паўтарыцца. Піша пятнаццацігадовая Каця Сусаніна свайму бацьку, чырвонаармейцу. 1943 год.

*«Дарагі, добры татачка! Пішу я табе пісьмо з нямецкай няволі. Калі ты, татачка, будзеш чытаць гэта пісьмо, мяне ў жывых не будзе. І мая просьба да цябе, бацька, пакарай нямецкіх крывапійцаў. Гэта завяшчанне тваёй паміраючай дачкі.*

*...Татачка, мне сёння споўнілася пятнаццаць гадоў, і калі б ты зараз сустрэў мяне, то не пазнаў бы сваю дачку. Я стала вельмі худзенькая, мае вочы ўваліліся, касічкі мне абстрыглі нагала, рукі высахлі, падобныя на граблі. Калі я кашляю, з рота ідзе кроў — у мяне адбілі лёгкія.*

*А памятаеш, тата, два гады таму, калі мне споўнілася 13 гадоў? Якія добрыя былі мае імяніны! Ты мне, тата, тады сказаў: «Расці, дачушка, на радасць вялікай!» Граў патэфон, сяброўкі віншавалі мяне з днём нараджэння, і мы пелі нашу любімую піянерскую песню...*

*А зараз, тата, як зірну на сябе ў люстэрка — сукенка рваная, у лапіках, нумар на шыі, як у злачынцы, сама худая, як шкілет. І салёныя слёзы цякуць з вачэй. Што толку, што мне споўнілася 15 гадоў? Я тут нікому не патрэбна. Тут многія людзі нікому не патрэбны. Бадзяжнічаюць галодныя, затраўленыя аўчаркамі. Кожны дзень іх выводзяць і забіваюць.*

*Так, тата, я рабыня ў нямецкага барона, працую ў немца Шарлэна прачкай, мыю бялізну, мыю падлогі. Працую вельмі многа, а ем два разы ў дзень у карыце з «Ружай» і «Кларай» — так клічуць гаспадарскіх свіней. Жыву ў дрывяным хляве, у пакой мне ўваходзіць нельга. Аднойчы пакаёўка, полька Юзэфа, дала мне кавалачак хлеба. А гаспадыня ўбачыла і доўга біла Юзэфу плёткай па галаве і спіне.*

*Два разы я збягала ад гаспадароў, але мяне знаходзіў іхні дворнік. Тады сам барон зрываў з мяне сукенку, біў нагамі. Потым на мяне вылівалі вядро вады і кідалі ў падвал... Завяшчаю, татачка, адпомсці за мяне».*

Пісьмо гэтае цудам захавалася, вырвалася з нямецкага палону і даляцела да нас, да роднай Беларусі. Сёння яно адбіта на чорнай адшліфаванай каменнай школьнай дошцы, якая стаіць перад трыма радамі белых, таксама з каменя, партаў «Мёртвага» школьнага класа, за якімі разам з Кацяй Сусанінай маглі б сядзець хлопчыкі і дзяўчынкі яе ўзросту. Маглі б, калі б не вайна. Калі б іх, маленькіх жыхароў Чырвонага Берага Жлобінскага раёна, іншых населеных пунктаў Гомельшчыны фашысцкія акупанты сілай не адбіралі ў бацькоў, змяшчалі ў канцлагер, а тых, хто выжыў, адпраўлялі ў Германію ў якасці донараў, каб іхняя маладая гаючая кроў аднаўляла сілы параненых салдат і афіцэраў вермахта.

За некалькі дзесяткаў крокаў ад віртуальнага «мёртвага» класа застыла ў бронзе нескароная Каця Сусаніна, як правобраз амаль дзвюх тысяч дзяцей, што эшалонамі былі вывезены з чырвонабярэжскага перасыльнага пункта-канцлагера ў Германію. Перад адпраўкай у барак канцлагера да малалетніх вязняў, што сядзелі на саломе, уваходзілі афіцэр і прыгожая жанчына, якая з усмешкай па-руску гаварыла: «Хто хоча кашы, хутка станавіцеся на двое ў рад. Павядзём вас карміць...» Есці хацелі ўсе, і ўсе імкнуліся ў той рад.

Тыя, каго павялі есці кашу, назад ужо не вярталіся. Ніколі! Яны зніклі бясследна. З тых амаль дзвюх тысяч дзяцей зборна-перасыльнага чырвонабярэжскага канцлагера вядомымі сталі толькі пятнаццаць імёнаў і прозвішчаў дзяўчынак і хлопчыкаў узростам ад васьмі да чатырнаццаці гадоў. Яны выбіты на ветразі карабліка-парусніка, які нібы імчыць па «Плошчы сонца» ў бязмежную прастору і сімвалізуе мары дзяцей, якія не збыліся з-за таго, што да іх душ дацягнулася страшэнная рука фашызму...

Тут жа, на «Плошчы сонца» — дваццаць восем вітражоў (планшэтаў) з малюнкамі, намаляванымі дзецьмі рэспублікі пасля вайны, якія ўзноўлены прафесійнымі масткамі ў нашы дні...

У памяць аб многіх тысячах дзяцей і ўзведзены мемарыяльны комплекс, які адкрыўся напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

«Дзецям — ахвярам вайны» — гэты комплекс у народзе паспелі ўжо назваць дзіцячай Хатынню. І нездарма на вачах ветэрана вайны, удзельніка абароны Ленінграда, а затым і блакадніка Сцяпана Іванавіча Берасенева, ураджэнца Жлобіншчыны, які стаяў на мітынгу побач са мной (ды ці толькі ў яго?) на вачах з'явіліся слёзы.

На мітынгу прысутнічалі старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон, архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх, вязень Чырвонабярэжскага канцлагера Ніна Мікалаеўна Мігай, кіраўнік творчага калектыву прафесар міжнароднай акадэміі архітэктуры, лаўрэат Ленінскай прэміі, аўтар праекта мемарыяла Леанід Левін, які выступіў, Часова паверанны ў справах Федэратыўнай Рэспублікі Германіі ў Рэспубліцы Беларусь Фрыд Нільзен і першы сакратар Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Станіслаў Удовенка. А ўзводзіў мемарыяльны комплекс «Дзецям — ахвярам вайны» калектыў адкрытага акцыянернага таварыства «Будаўніча-мантажны трэст № 40» са Жлобіна.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.44 | 21.43 | 16.59 |
| Віцебск | 4.25 | 21.41 | 17.16 |
| Магілёў | 4.34 | 21.34 | 17.00 |
| Гомель | 4.40 | 21.21 | 16.41 |
| Гродна | 5.01 | 21.57 | 16.56 |
| Брэст | 5.11 | 21.48 | 16.37 |

### Імяніны

*Пр. Георгія, Максіма, Паўла, Юліяна;*
*К. Альжбеты, Мальвіны, Андрэя, Інакенція, Себасцьяна, Тодара.*

### Месяц

*Апошняя квадра 7 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

**Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 04.07.2007**

| Для бясвоблачнага неба | З улікам прагназуемай воблачнасці |
|---|---|
| UV INDEX 65 | UV INDEX 39 |

| | |
|---|---|
| Экстрэмальны | 11+ |
| Вельмі высокі | 8—10 |
| Высокі | 6—7 |
| Умераны | 3—5 |
| Нізкі | 1—2 |

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **15 хвілін.**

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| Горад | Тэмпература | Горад | Тэмпература |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +14 — +16 °C | МАСКВА | +26 — +28 °C, Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +15 — +17 °C | РЫГА | +18 — +20 °C |
| КІЕЎ | +21 — +23 °C | С-ПЕЦЯРБУРГ | +19 — +21 °C, Без ападкаў |

# ВУСНАМІ ПАДЛЕТКА

## Распавядаецца аб падзеях вайны ў фільме «Ворагі»



**Тэму вайны абрала для сваёй дэбютнай іграվой мастацкай карціны малады рэжысёр Марыя Мажар. Дзяўчына, пра якую зараз толькі і гавораць: каб стаць рэжысёрам, яна паехала вучыцца ў Маскву. Вядомы рэжысёр Аляксей Учыцель узяў беларускую дзяўчыну пад сваю апеку, дзякуючы чаму яна атрымала магчымасць працаваць над фільмам «Ворагі» ў яго аб'яднанні «Рок». А сам фільм здымаўся пры фінансавай падтрымцы Федэральнага агенства па культуры і кінематаграфіі Расійскай Федэрацыі. Натуральна, на нашай базе, і самі здымкі адбываліся ў Беларусі: кіно распавядае пра жыццё акупаванай немцамі беларускай вёскі. А прэм'еру фільма «Ворагі» вырашылі прымеркаваць да Дня Незалежнасці.**

Марыя Мажар захацела сказаць сваё слова ў гэтай тэме — слова новага пакалення. З'явілася столькі новых расійскіх карцін, якія даюць глебу для роздуму і перажыванняў, і гісторыі ў іх усе такія чалавечыя, з разуменнем і павагай да таго, што перажыло ваеннае пакаленне. Але беларусы нічога падобнага дагэтуль прапанаваць не маглі. Марыя сама напісала сцэнарый, які чакаў свайго часу даволі даўно.

Маладая дзяўчына, якая скончыла беларускі Універсітэт культуры, хацела вучыцца далей. Перспектывы стаць рэжысёрам у Беларусі ўяўляліся цьмяна. Яна ўзяла свой сцэнарый — і рушыла прама ў Маскву. Экзаменацыйная камісія Усерасійскага Дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі, пачытаўшы яго, адразу залічыла беларускую дзяўчыну на аддзяленне рэжысуры іграվога кіно. Потым сцэнарый быў адзначаны «Сярэбраным Віцязем». І нарэшце, пад канец вучобы, Марыя пачала здымаць свой поўнаметражны дэбют. У беларускіх вёсках, па беларускіх правілах. Даводзілася шмат узгадняць, тлумачыць, што за фільм гэта будзе, каб не было нечаканасцяў там, дзе іх быць не павінна. Там іх і няма...

Па выніку працы зразумела: Марыя сапраўды ўмее здымаць кіно, і можна парадавацца за з'яўленне новага рэжысёра — фільмам «Ворагі» яна мае намер пачаць трылогію, прысвечаную вайне. Першы ваенны фільм маладога рэжысёра прыемна вылучаецца з таго, што здымалася на гэту тэму на «Беларусьфільме».

Кіно атрымалася дзіўнае. На маё адчуванне.

Акупацыя, 42-і год. Вёска жыве сваім жыццём. У ёй жанчыны, дзеці і адзін дзед, які час ад часу чужынцам дробныя жартачкі чыніць. Гэтай вёсцы пашчасціла наладзіць з акупантамі больш-менш нармальныя адносіны. З мясцовым насельніцтвам немцы жывуць ладна, шукаюць разумення, нават чытаюць Гейне вясковым жанчынкам. І жанчыны разумеюць: немцы — такія ж людзі. Толькі салдаты, якіх сюды накіравалі камандзіры. Зразумела, усё было менавіта так. І сумленныя людзі сярод немцаў былі, і адукаваныя, і па-чалавечы чулыя. Канешне. Для мяне ў гэтым няма нічога новага — абедзве бабулі перажылі акупацыю, у адной было пяцёра дзяцей, у другой — трое. Мама нават распавядала, як яе маленькага брата нямецкі салдат частаваў цукеркамі, але ж бабуля ўсё роўна трымала вуха вострым. Увесь драматызм вайны якраз у тым, што адны харошыя людзі вымушаны прыходзіць туды, дзе ўжо жывуць іншыя харошыя людзі.

Праўда, у фільме «Ворагі» яны вучыліся суіснаваць разам — таксама ў многім апраўданае памкненне. Пакуль людзі не зразумелі, што трагедыя можа разыграцца незалежна ад іх волі і добрага стаўлення адных да другіх. І даволі хутка — усё адбылося за тры дні. І гэтыя тры дні — тое, як пражывае іх галоўная гераіня — мяне ўразілі. Дзіўны погляд на мацярынскую любоў.

Трагедыя адбылася — маленькага хлопчыка злавілі на дыверсіі. Маці пра гэта даведваецца нечакана.

Сына тры дні не было дома, а яна неяк паміж справамі пра яго ўзгадвае: напэўна, пабег у суседнюю вёску. Гісторыя гераіні, якую яна сама распавядае з экрана, кранае: муж са старэйшымі сынамі загінуў яшчэ да вайны. Застаўся толькі гэты хлопчык — яе надзея. Яго тры дні ніхто не бачыў... А маці гэта не бянтэжыць, яна сядзіць, спакойна лузгае семкі са сваім нямецкім пастаяльцам. І гэта пры тым, што з боку іншых вёсак час ад часу даносіцца дым — ім меней пашчасціла на добрых гасцей. Я нечага не разумею: маці, у якой апошняе дзіця, якая ўжо ведае, што такое страты, не бяжыць у суседнюю вёску (куды нават дзіця дабегчы можа), не шукае яго, не кліча, не шукае яго на вуліцы, не падае на калені ў малітве за сына перад абразамі (а яны віселі ў куце ледзь не любой вясковай хаты, не гледзячы ні на якіх камуністаў)... Цяжка паверыць, што нармальная беларуская жанчына так бы сябе паводзіла ў такі момант.

Толькі пазней разыгрываюцца яе пакуты, калі пра бяду расказала суседка (якая паводле фільма атрымала «пахаванку» на мужа. Як можна было атрымаць «пахаванку» ў акупацыі — яшчэ адно цікавае пытанне, на якое няма лагічнага адказу...).

Пакуты маці пераканаўча ўвасобіла расійская актрыса Юлія Ауг. Так, было балюча на гэта глядзець. Нават цяжка было паверыць, што гэта тая ж самая жанчына. Толькі цяпер яна стала іншай, каб паводле сцэнарыя зрабіць свой правільны выбар: ёй прапанавалі замяніць свайго зняволенага сына на іншага хлопчыка. Яна яшчэ не ведае, што сына забілі амаль адразу ж. Яна вядзе чужога хлопчыка, але па дарозе кідае, пераплывае раку сама. І на бераг падымаецца хмурая расхрыстаная жанчына з дрынам у руцэ, вельмі падобным на касу...

Мне здаецца, у гэтай стужцы самае каштоўнае — жаданне беларускай дзяўчыны звяртацца да ваеннай тэмы, разважаць аб тым, што і як магло адбывацца. Канешне, цяжка ўявіць усё, канешне, магчымыя недакладнасці, якіх былі пазбаўлены прайшоўшыя і перажыўшыя вайну стваральнікі ранейшых фільмаў. Але каштоўнае і тое, што Марыя Мажар змагла пераканаць расійскіх партнёраў (і ёй паверылі!): у тэме існавання ў акупацыі можна знайсці яшчэ многа паваротаў, адкрытых пытанняў, новых сюжэтаў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Звязда–90: адваротны адлік

**Да юбілею «Звязды» засталося 36 дзён**

# «Радавацца жыццю і прыкмячаць усе яго колеры»



Фота БЕЛТА.

**З мастаком Леанідам Шчамялёвым нашу газету яднаюць не толькі артыкулы, якія былі прысвечаны майстру. Не толькі цікавасць і любоў да самай міралюбівай чалавечай прафесіі, ці нават ладу жыцця. Быў момант у гісторыі краіны, калі лёс газеты і чалавека па імені Леанід Шчамялёў ішоў паралельна — вайна. Леанід Дзмітрыевіч быў сярод тых людзей, якія набліжалі перамогу.**

**Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, народны мастак Беларусі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны:**

— Лёс «Звязды», як і мой асабісты, пралягаў праз вайну. Я ведаю, што газета ўдзельнічала ў падпольнай працы. Нават ведаю мастакоў, якія тады прымалі ўдзел у вялікай справе, якую вяла «Звязда». Важна тое, што газета паспяхова прайшла праз гэтае выпрабаванне і потым, у мірны час, не згубіла сваёй вастрыні і актуальнасці. Яна ўвесь час была на слыху, адыгрывала нават немалую ролю ў грамадскім жыцці, прыцягвала ўнікальным сучасным поглядам на падзеі ў краіне і свеце.

Канешне, можна сёння разважаць пра гістарычнае мінулае, але для мяне найбольш важна іншае: той погляд на творчасць беларускіх мастакоў, пра які людзі даведваюцца са старонак газеты, у тым ліку ўвага да маёй творчасці. І ведаеце чаму? Калі ёсць жаданне пісаць і разважаць аб творчасці, то значыць, жыццё ў краіне рушыць нармальным шляхам, і ёй нічога не пагражае.

Зараз газета — увасабленне мірнага жыцця. Яна цікавая сама па сабе — актуальнымі палітычнымі, сацыяльнымі і чалавечымі тэмамі. Але, на мой погляд, яна б яшчэ выйграла, калі б больш ўвагі надавала тэме выяўленчага мастацтва нашай краіны, працэсам, якія адбываюцца ў гэтай сферы, ды і ўвогуле ў культуры, давала б грунтоўны аналіз самой мастацкай сітуацыі, узбагачала б сябе і іншых праз такія тэмы. Таму што гэта — новыя фарбы, пачуцці, якія нясуць творцы, энергія, якая абуджае лепшыя чалавечыя сілы і памкненні. Трэба радавацца жыццю, прыкмячаць усе яго колеры. Мы нараджаемся, каб жыць, адчуваць, захапляцца светам — і радавацца, калі нехта ўмее ўсё гэта таленавіта адлюстраваць. А чаго вартыя таленты, вы ведаеце.

Я жадаю, каб «Звязда» была заўсёды таленавітай. Яркай, незгасальнай зоркай, якая нясе святло і заўсёды дае надзею. Дай Бог здароўя ўсім, хто робіць газету!

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Новым вуліцам — дастойныя назвы

**Новыя назвы жылых раёнаў і вуліц сталіцы зацвердзілі дэпутаты Мінскага гарадскога Савета.**

Мікрараён Дружба-1, 2, 3 атрымае назву Брылевічы-1, 2, 3. Так называўся фальварак, які размяшчаўся ў гэтай мясцовасці ў XVI стагоддзі. А жылы раён Масюкоўшчына-3, 4,5, што будуецца, будзе Дамброўка-3, 4, 5.

Народныя выбраннікі падтрымалі таксама ідэю аб ушанаванні ў назвах вуліц, якія праектуюцца, імёнаў знакамітых пісьменнікаў, паэтаў, вучоных, кампазітараў, грамадскіх дзеячаў. Так, у хуткім часе з'явяцца вуліцы, названыя ў гонар беларускага паэта і фалькларыста Яна Чачота, кампазітара і мастака Напалеона Орды, польскага культурнага дзеяча Ежы Гедройца, народнага артыста БССР, аднаго з заснавальнікаў беларускага тэатра Уладзіслава Галубка, кампазітара і педагога прафесара Іосіфа Жыновіча, першага прэзідэнта Акадэміі навук БССР Усевалада Ігнатоўскага, паэта Алеся Гаруна і інш. Варта таксама адзначыць, што вуліца Свабоды ў мікрараёне Усход будзе перайменавана ў вуліцу Гвішыяні. Курсант Ваеннай акадэміі, кавалер ордэна «За асабістую мужнасць» Дзмітрый Гвішыяні загінуў падчас тушэння цягніка, які гарэў.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,** *«Мінск-Навіны».*

## 4 ліпеня

### Дзве даты

**1667 год** — адкрыты адзін з першых міждзяржаўных паштовых маршрутаў праз тэрыторыю Беларусі: Вільня—Мінск—Магілёў—Смаленск—Масква.



**1848 год** — упершыню апублікаваны «Маніфест Камуністычнай партыі» К. Маркса: «Прывід камунізму блукае па Еўропе...».

### Цытата дня:

***«Спачатку прывядзі ў парадак свой уласны пакой, а ўжо пасля бярыся за астатні свет».***

**Ніл Джордан (нар. 1950), ірландскі рэжысёр.**

Інфарм-укол

# Травы — не панацэя

**Некаторыя мяркуюць, што травамі можна вылечыць практычна ўсё. Гэта няпраўда.**

Скажам, зборы з эхінацыяй, як паказалі даследаванні, не толькі не пазбавілі ўдзельнікаў эксперымента ад прастуды, але і не аблягчылі сімптомы. Тыя, хто прымаў кава-кава, якая павінна пазбаўляць пачуццё трывогі, за чатыры тыдні ўжывання гэтай расліны так трывогі і не пазбавіліся. Чартапалох малочны, або растаропша, а дакладней, прэпараты, у склад якіх уваходзіць апошняя, не лечаць хваробы печані, а таксама не дапамагаюць рабоце гэтага органа. Іншая справа, імбір — 350 мг імбіру тры разы на дзень сапраўды пазбаўляе цяжарных жанчын ад ранішняй млосці. А брытанскія вучоныя вынайшлі ў крыві тых, хто рэгулярна ўжывае чай з рамонку, асаблівыя злучэнні, якія дазваляюць арганізму змагацца з запаленнямі і спазмамі. Апошнія даследаванні даказалі, што гінгка білоба можа палепшыць памяць. Акрамя таго, прыём прэпаратаў з гінгка зніжае рызыку захворвання на рак яечнікаў на 60 працэнтаў.

Перад тым, як пачаць прыём лекавых сродкаў на аснове траў, абавязкова варта пракансультавацца з урачом. Пры адначасовым прыёме траў і некаторых традыцыйных лекаў магчымыя сур'ёзныя ўскладненні.

# Пракаціцца на «Карэце»



Напярэдадні Дня Незалежнасці ў сталіцы з'явіліся дзве новыя дэкаратыўныя скульптурныя кампазіцыі: на плошчы Незалежнасці, ля Камітэта архітэктуры, паўстаў «Дойлід» у паўтара чалавечыя росты, а каля гарадской ратушы на плошчы Свабоды — запрэжаная двума конямі «Карэта».

Гэтыя скульптуры сталі падарункам — і ўсёй краіне, і роднаму гораду да 940-гадовага юбілею — ад знакамітага мінскага скульптара Уладзіміра Жбанава. Дарэчы, работы ў пэўным сэнсе юбілейныя для мастака: дзесятая і адзінаццатая па ліку. Раней былі «Паштальён» непадалёк ад Дома друку, «Дзяўчынка з парасонам», «Дама на лавачцы» і «Мужчына, які прыкурвае» ў Міхайлаўскім сквэрыку, скульптурная група на Камароўскім рынку: «Конь», «Дама з сабачкам», «Фатограф», «Дзве гусі» і «Лазеншчык» у дворыку мінскай лазні № 7, пабудаванай яшчэ ў 1939 годзе. Асобна стаіць «нявулічная» работа скульптара — фігура грэчаскай багіні, зробленая па заказу фітнэс-цэнтра ў футбольным манежы (стаіць у зале). І гэта толькі ў Мінску — але яшчэ скульптуры Жбанава ёсць у Магілёве («Зорнік» з тэлескопам на Плошчы Зорак), у Падмаскоўі, Паўлаградзе і нават у нямецкім Дзюсельдорфе. А новых праектаў у майстра дык і ўвогуле безліч — скажам, помнік Шуру Балаганаву, які мяркуецца ўсталяваць у Бабруйску, задуманы нават у двух варыянтах. Гэтаксама гатовыя і чакаюць свайго часу помнік рэвізору, постаць дзяўчыны з ландышамі, якая сустракае цягнікі, і яшчэ цэлы шэраг скульптур. Пытанне, як заўжды, вырашаецца мастацка-экспертным саветам, згодай гарадскіх уладаў і наяўнасцю грошай на ліццё чарговай скульптуры...

Новыя работы Жбанава за выхадныя паспелі ўжо аблюбаваць мінчане і госці сталіцы — у «Карэце» не сфатаграфаваўся толькі лянівы (кампазіцыя, як расказалі аматары «пракаціцца», цалкам рэалістычная — так і здаецца, што павозка вось-вось кранецца), а да помніка ўсім архітэктарам «Дойліда» ходзяць цэлыя экскурсіі. Сам жа Уладзімір Іванавіч, хоць і прымае ўхваленні ў свой адрас, з усмешкай сцвярджае, што самая лепшая яго работа — «тая, якую яшчэ зраблю». Шчыра на гэта спадзяёмся. Як і на тое — цьфу-цьфу — што суграмадзяне будуць ставіцца да новых работ беражліва, не «адкалупваючы» ні спіцы з колаў веласіпеда Паштальёна, ні кавалкі парасона ў Дзяўчынкі, ні вераб'я з сядла Каня... Прыходзьце, глядзіце, фатаграфуйцеся — і атрымлівайце задавальненне!



**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

## Усміхнёмся!

— Мама, сёння ў садку такое было!
— Што было?
— Нам прышчэпкі рабілі!
— Ты хоць не плакала?
— Не!
— Дзіўна, а чаму?
— Яны мяне не дагналі!

☺

**Грошы, якія вы прывезлі з адпачынку, — гэта згубленае задавальненне!**

☺

У каўказскім «Макдональдсе»:
— Свабодны мангал! Свабодны мангал!

☺

**Калі жонка папракае вас пастаяннымі п'янкамі, нагадайце ёй, што футра ёй вы купілі на здадзеныя бутэлькі.**

☺

У шлюбным агенцтве.
— Вы каму аддаяце перавагу, міс: бландзінам ці брунетам?
— Мне хацелася б рудога! Ведаеце, у мяне ўся мэбля чырвонага колеру!



☺

**Маці — дачцэ:**
**— Бяры прыклад з мяне, я ўжо 20 гадоў замужам і ўвесь гэты час кахаю толькі аднаго мужчыну!**
**— Уяўляю, які будзе скандал, калі тата даведаецца!..**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл/факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

**html:** www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 33.598. Індэкс 63850. Зак. № 3573. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**